СВЕТ нашых захапленняў

# Вершы аб Радзіме

## Пятро ПРЫХОДЗЬКА

### ШЛЯХ ДАДОМУ

Я ў многіх пабываў краях,
Праходзячы праз дні і ночы.
І не такі быў просты шлях,
Каб анідзе з яго не збочыць.
Дарогай доўгаю вайны
Ішоў праз буры і трывогі.
Спавіць бы ў ранах шар зямны,
Хапіла б той адной дарогі.
Ад смерці на паўкрока быў,
Ды стаў на горла ёй у злосці.
Мо шмат чаго ў шляху згубіў,
Але здабыў, напэўна, штосьці.
Да Эльбы між байцоў сваіх
Вяла мяне зямля другая.
Хто ведаў з хлопцаў баявых,
Што Бесядзь ёсць — рака такая?
Угледзеўшыся пільна ў далі,
Планеты розных два бакі
Бліжэй адзін другому сталі.
Перада мною праплылі
Еўропы ўсёй абшары, пляцы.
Ды на чужой на той зямлі
Не мог ні дня я заставацца.
Дадому клікаў родны край
Палямі, рэкамі, лясамі.
Тут адгукнуўся светлы май
Усімі з неба галасамі.
І сёння ў байцы з нематой
Дам волі больш сабе самому.
Мне шлях кароткі самы той,
Што адусюль вядзе дадому.

**Прыходзька, П. Вершы аб Радзіме** / Пятро Прыходзька // Шлях Кастрычніка. — 1996. — 16 лістапада. — С. 3.